# Памяти ученого

# Памяці вучонага

# To the memory of scientist

**Ираида Осиповна**
**ЦАРЮК**

**Іраіда Осіпаўна**
**ЦАРУК**

**Iraida Osipawna**
**CARUK**



Беларуская гістарычная навука панесла вялікую страту. 14 чэрвеня 2019 г. на 92-м годзе жыцця пасля цяжкай і працяглай хваробы памерла Іраіда Осіпаўна Царук – выдатны арганізатар гістарычнай адукацыі і навукі, дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1973–1986 гг., заслужаны работнік вышэйшай школы БССР, доктар гістарычных навук, прафесар.

Іраіда Осіпаўна нарадзілася 29 лютага 1928 г. у в. Гаркавічы Сакольскага павета Беластоцкага ваяводства (цяпер Польшча). У 1948 г. скончыла з адзнакай Нясвіжскае педагагічнае вучылішча і была накіравана на вучобу ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Пасля завяршэння навучання на гістарычным факультэце вучылася ў аспірантуры БДУ. З 1957 па 1963 г. І. О. Царук працавала ў Мінскім гаркаме, абкаме КПБ. У кастрычніку 1963 г. Іраіда Осіпаўна вярнулася ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, з ім была звязана яе наступная працоўная дзейнасць. У 1965 г. І. О. Царук паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную культурным пераўтварэнням у заходніх абласцях Беларусі. 13 гадоў яе жыцця былі аддадзены плённай працы на пасадзе дэкана гістарычнага факультэта БДУ (1973–1986 гг.). Пасля Іраіда Осіпаўна працавала на пасадзе загадчыка кафедры гісторыі Беларусі.

Доктарскую дысертацыю І. О. Царук абараніла ў 1975 г., тады ж атрымала навуковае званне прафесара. Іраіда Осіпаўна даследавала пытанні палітычнай гісторыі XX ст., нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР, разгортвання нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Бе-

CC BY NC

ларусі ў міжваенны перыяд. Падчас працы дэканам і загадчыкам кафедры раскрыліся выдатныя якасці Іраіды Осіпаўны як кіраўніка і выкладчыка, прыйшлі разуменне і здольнасць вырашаць надзённыя патрэбы развіцця ўніверсітэцкай гістарычнай адукацыі і навукі. Неабыякавасць да даручанай справы ў яе заўсёды спалучалася з чалавечым стаўленнем да калег і вучняў. Іраіда Осіпаўна – аўтар звыш 100 навуковых публікацый. Пад яе кіраўніцтвам і пры яе кансультаванні абаранілі доктарскія і кандыдацкія дысертацыі больш чым 30 саіскальнікаў. Жыццёвы шлях І. О. Царук, яе родных і блізкіх, вірлівыя падзеі ХХ ст., гераізм і трагізм падзей Першай сусветнай вайны, рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага развіцця выдатна адлюстраваны ў кнігах, якія былі напісаны Іраідай Осіпаўнай пасля яе выхаду на пенсію.

Рэдакцыйная калегія «Часопіса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя» і калектыў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта глыбока смуткуюць з прычыны смерці Іраіды Осіпаўны і выказваюць шчырыя спачуванні яе родным і блізкім.

Светлы вобраз Іраіды Осіпаўны Царук, аднаго з самых адметных дэканаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, гісторыка-патрыёта, грамадзяніна і чулага чалавека назаўсёды застанецца ў нашай памяці.

***А. Г. Каханоўскі***[1],
***С. М. Ходзін***[2]

[1]*Александр Геннадьевич Кохановский* – доктор исторических наук, профессор; декан исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі* – доктар гістарычных навук, прафесар; дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aliaksandr G. Kakhanouski*, doctor of science (history), full professor; dean of the faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *Kohanovsky@bsu.by*

[2]*Сергей Николаевич Ходин* – доктор исторических наук, профессор; профессор кафедры источниковедения исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Сяргей Мікалаевіч Ходзін* – доктар гістарычных навук, прафесар; прафесар кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Sirghei N. Khodzin*, doctor of science (history), full professor; professor at the department of source study, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *skhodzin@mail.ru*